# ЖЫЦЬ І ВУЧЫЦЦА З КАМФОРТАМ

## У Гродне з'явіўся 13-павярховы інтэрнат для студэнтаў медыцынскага ўніверсітэта

**Калі да будаўніцтва новага інтэрната жыллём было забяспечана 54 % студэнтаў-медыкаў, дык цяпер — каля 80 %. Тут будзе жыць больш за тысячу чалавек.**



Падзея для горада даволі значная. Таму і ўрачыстае адкрыццё адбылося з удзелам кіраўніцтва Гродзенскай вобласці, міністра аховы здароўя, прадстаўнікоў дэпутацкага корпуса. Пасля ўрачыстага адкрыцця прысутныя пазнаёміліся з «начынкай» інтэрната. А яна даволі камфортная. У кожным блоку — па тры пакоі, і ўсе яны разлічаны на пражыванне толькі двух чалавек. На блок — свая кухня і санвузел. Па сутнасці, гэта міні-кватэра, дзе можна не толькі «перакантавацца», але і якасна існаваць. Для падрыхтоўкі да заняткаў абсталяваны сучасныя чытальныя залы, ёсць спартыўныя залы, буфет.

На думку **міністра аховы здароўя Уладзіміра КАРАНІКА**, новы інтэрнат дазволіць павысіць якасць падрыхтоўкі медыцынскіх кадраў праз стварэнне неабходных умоў для навучання і камфортнага пражывання.

Інтэрнат дасць магчымасць павялічыць экспарт адукацыйных паслуг. **Рэктар універсітэта, член Савета Рэспублікі Віктар СНЯЖЫЦКІ,** расказаў, што калі сем гадоў таму ў ВНУ былі толькі тры групы замежных студэнтаў, дык цяпер такіх груп больш за трыццаць. Гэта чацвёртая частка ўсіх студэнтаў медыцынскай навучальнай установы.

У новым інтэрнаце для замежных студэнтаў прадугледжана каля паловы месцаў. Як падкрэсліў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ**, у Гродне жадае вучыцца шмат замежнікаў, і цяпер медыцынскі ўніверсітэт зможа павялічыць іх набор удвая, што дазволіць значна кампенсаваць сродкі, укладзеныя ў будаўніцтва 13-павярховага інтэрната. А гэта — 30 мільёнаў рублёў з мясцовага і рэспубліканскага бюджэтаў.

Па словах міністра аховы здароўя, студэнцкі інтэрнат — прыклад сумеснай работы рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады ў комплексным падыходзе да далейшага развіцця сістэмы аховы здароўя Гродзенскай вобласці. Напрыклад, сёлета плануецца такім чынам набыць сучасныя камп'ютарныя і магнітна-рэзанансныя тамографы ў бальніцы абласнога цэнтра.

У 2020 годзе таксама будзе працягнута работа па забеспячэнні жыллём студэнтаў, якіх у Гродне вучыцца каля 20 тысяч чалавек. Увод у эксплуатацыю інтэрната для медыкаў — толькі першы крок вырашэння гэтай праблемы. Як адзначыў Уладзімір Краўцоў, сёлета ў дзяржаўнай інвестыцыйнай праграме прадугледжаны сродкі для завяршэння будаўніцтва аналагічнага аб'екта на 1030 месцаў для студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Яго праект быў распрацаваны яшчэ 10 гадоў таму, і ў хуткім часе будаўніцтва 13-павярховага інтэрната будзе завершана. Дарэчы, гэтая праблема была агучана кіраўніку дзяржавы падчас яго візіту ў Гродна восенню мінулага года. У выніку для ўзвядзення будынка выдзелены сродкі з рэспубліканскага бюджэту.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Репозиторий ГрГМУ